УДК 316.728:008(4)"04/185"

*В. С. Сідаровіч*

# Канцэпт паўсядзённасці ў еўрапейскай культуры (ад старажытнасці да сярэдзіны XIX ст.)

*Артыкул прысвечаны гісторыка-філасофскаму агляду ідэй, на падставе якіх з другой палавіны XIX ст. пачаліся даследаванні з'явы паўсядзённасці. Разглядаюцца антычная ідэя «агульнага здаровага сэнсу», асаблівасці паўсядзённага жыцця чалавека праз тэацэнтрычную прызму ў Сярэдневякоўі. Прасочваюцца ўплыў сацыякультурных асаблівасцей эпохі Адраджэння на фарміраванне ўяўлення аб паўсядзённасці, адасабленне канцэпцыі «прыватнага жыцця» ў XVII ст., зварот да ўнутранага свету чалавека ў XVIII ст., а таксама рэпрэзентацыя гэтых працэсаў у культурнай спадчыне Беларусі. Падкрэсліваецца актуальнасць феномена паўсядзённасці, які раскрывае аб'ектыўную (уздзеянне грамадства) і суб'ектыўную (індывідуальнае развіццё асобы, яе ўзаемадзеянне з соцыумам) сутнасць быцця чалавека.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучасных гуманітарных даследаваннях разгляд феномена паўсядзённасці займае трывалыя пазіцыі. Увага навукоўцаў да гэтай з'явы стала своеасаблівым адказам на многія грамадскія пытанні, звязаныя з падмуркам, сродкамі і шляхамі існавання чалавека ў сусвеце. Сапраўды, ментальнасць грамадства, духоўныя і матэрыяльныя аспекты яго жыцця, засваенне чалавекам навакольнага асяроддзя нязменна выклікаюць інтарэс. Знаёмячыся з аспектамі існавання людзей у мінулым, сучасны чалавек суадносіць з гэтым уласны досвед і лепей разумее і сябе, і навакольную рэальнасць. Невыпадкова ў гістарычнай навуцы ў 1960–1970-х гг. распачаўся антрапалагічны, ці культурны паварот, які змяніў не толькі даследчыцкія прыярытэты, але і метадалогію навуковай працы. Адной з галоўных праблем у вывучэнні паўсядзённасці з'яўляецца адсутнасць добра распрацаванай тэрміналогіі. Звернемся да пазіцыі прадстаўнікоў германскага кірунку ў развіцці «гісторыі паўсядзённасці», у прыватнасці да А. Людтке. Ён адзначаў, што галоўнымі ў паўсядзённасці з'яўляюцца жыццёвыя праблемы асобных людзей, груп. Індывіды прадстаюць і дзеючымі асобамі, і творцамі гісторыі, якія змяняюць сацыяльна-палітычныя рэаліі мінулага і сучаснасці [18, с. 77]. На яго думку, гісторыя паўсядзённасці як шматслойны працэс узнаўляецца, трансфармуецца тымі, хто з'яўляецца адначасова і аб'ектамі, і суб'ектамі гісторыі.

Паспрабуем прасачыць генезіс паняцця «паўсядзённасць». Паводле трактоўкі А. Шуца, «паўсядзённасць» – гэта сфера чалавечага вопыту, якая характарызуецца асаблівым шляхам успрымання і разумення свету і ўзнікае на падставе эмпірычных даных [34, с. 114–162]. Ю. М. Лотман атаясамліваў паўсядзённасць са светам ідэй, інтэлектуальнымі, маральнымі, рэлігійнымі каштоўнасцямі [17, с. 10].

У аснову даследаванняў паўсядзённасці беларускімі вучонымі XX–XXI стст. пакладзены прынцыпы міждысцыплінарных і сістэмных падыходаў, якія выкарыстоўваюцца ў гістарыяграфіі, гуманітарыстыцы (А. Іакела, У. Сідарцоў, А. Скеп'ян, А. Кур'яновіч, Ю. Бохан і інш.) [3; 5, с. 150].

У загаловак дадзенага артыкула невыпадкова вынесена храналагічная канстанта – ад старажытнасці да сярэдзіны XIX ст. Менавіта ў другой палавіне XIX ст. пачалося вывучэнне паўсядзённасці ў гуманітарных навуках, якое грунтавалася ў першую чаргу на бытапісальніцтве і этнаграфічных матэрыялах. Таму невыпадкова першы этап вывучэння гэтай з'явы, які працягваўся да пачатку XX ст., называюць этнаграфічным. Ён звязаны з даследаваннямі такіх вучоных, як Л. Леві-Бруль, М. Мос, Э. Б. Тайлар, П. Шпілеўскі [15; 22; 29; 33]. У працах яны акцэнтавалі ўвагу на апісанні побыту, звычак, рэлігійных і сацыяльных практык. Назапашаны імі эмпірычны матэрыял стаў падмуркам для вывучэння «гісторыі ментальнасці».

Аднак феномен паўсядзённасці ўсведамляўся і асэнсоўваўся з даўніх часоў.

Разуменне паўсядзённасці ў антычныя часы звязана з полісным сістэмай і дзяржаўным ладам. Як адзначаў П. Гіро, афінянін самастойна вырашаў пытанні, якія датычыліся грамадскіх інтарэсаў, што давала магчымасць вызначаць кірунак развіцця грамадства. Ролю дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў у жыцці чалавека паказвае і вызначэнне катэгорыі «шчасце». Так, афінскаму палітыку Салону давялося сустрэць шчаслівага чалавека Тэла, які жыў у квітнеючы час свайго горада з сям'ёй у гармоніі і згодзе, а ў ваенным паходзе доблесна змагаўся і загінуў, звярнуўшы ворагаў-элеўсіян ва ўцёкі [4].

Жыццё антычнага чалавека было вельмі гарманічным. Як адзначаў Арыстоцель, асновай гарманічнага жыцця з'яўляецца злучэнне энергіі характару і разумовай тонкасці. Акрамя таго, політэістычная старажытнагрэчаская рэлігія давала магчымасць чалавеку вызваліцца ад эматыўнага ціску.

У якасці элемента сацыяльнага жыцця праблема навакольнага асяроддзя паўстала ў часы архаічнай культуры ў Старажытнай Грэцыі, калі свядомасць чалавека была звязана з космасам і міфамі. Непасрэдна праз абрады і рытуалы, якія фарміравалі жыццё індывіда, выбудоўвалася далейшая карціна свету. Кожны этап жыцця чалавека – нараджэнне, шлюб, смерць і г. д. – разглядаўся праз прызму міфа і запазычваў яго мову [9].

З развіццём рэлігійных уяўленняў адбывалася і ўскладненне поглядаў на чалавека, навакольнае асяроддзе і сацыяльнае ўзаемадзеянне паміж людзьмі. Вера чалавека ў алімпійскіх багоў адбывалася поруч з паступовым фарміраваннем этыкі старажытнагрэчаскага грамадства, асноўная

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

асаблівасць якога ў з'яўленнні людзей поліснага тыпу. Для чалавека Антычнасці поліс і грамадства – дзве амаль раўназначныя велічыні. Поліс забяспечваў жыццядзейнасць людзей ва ўсіх яе формах, даючы магчымасць чалавеку жыць у межах грамадскіх норм – «узважаць» свае словы і ўчынкі, не захапляцца легкадумнымі ідэямі і прапановамі і г. д. Такое пачуццё правільнасці і агульнага дабра атрымала ўвасабленне ў катэгорыі «агульнага здаровага сэнсу» Арыстоцеля [2; 9, с. 89].

«Агульны здаровы сэнс» у пэўнай ступені з'яўляецца сукупнасцю жыццёвага вопыту грамадства ці сацыяльнай групы. У дадзеную катэгорыю можна ўключыць набор сацыяльных норм і правіл, сукупнасць ведаў аб карыстанні прадметамі і аб паводзінах у грамадстве. Асноўнай адметнасцю «агульнага здаровага сэнсу» з'яўляецца яго сітуатыўнасць, выкарыстанне розных мадэлей паводзін у залежнасці ад навакольных падзей. Як адзначае В. Д. Лелека, найбольш яскравае ўяўленне аб сітуатыўным характары «агульнага здаровага сэнсу» даюць прыказкі і прымаўкі, яны з'яўляюцца своеасаблівай мадэллю тагачаснага свету [16; 24].

Атрымаўшы ўвасабленне ў культуры Антычнасці, катэгорыя «агульнага здаровага сэнсу» будзе сустракацца ў кантэксце паўсядзённасці ў наступныя эпохі, найбольш яскрава праявіўшы сябе ў філасофіі здаровага сэнсу (XVIII ст.) і інтуітывізме (мяжа XIX–XX стст.).

Улічваючы кансерватыўны характар жыцця старажытных рымлян і ўспрыманне імі грунтоўных ідэй аб адносна «нязменным ладзе існавання», ствараліся пэўныя правілы ўзаемадзеяння і ідэальная мадэль грамадства. Выкананне законаў, глыбокая пашана да аўтарытэтных грамадзян і багоў – адметныя рысы рымскага грамадства. Парушэнне прынятых правіл паводзін уносіла ў грамадства своеасаблівы сімбіёз супярэчнасцей. З гэтага вынікае, што паўсядзённасць жыцця ў рымлян разумелася ў якасці супрацьвагі дабрачыннасці. Яна імкнулася разбурыць падмуркі грамадства і аслабіць Рым.

Як і грэкі, рымляне лічылі сябе часткай грамадзянскай супольнасці («civitas»), дзе яны маглі рэалізаваць асабістыя каштоўнасці – свабоду, справядлівасць, веру і вернасць. Такая «поліснасць» была настолькі моцнай, што працягвала ўплываць на жыццё людзей да позняй Антычнасці [10, с. 199].

У эпоху Сярэдневякоўя, якая пачалася з падзення Заходняй Рымскай імперыі ў 476 г., адбыліся сур'ёзныя змены ў светаўспрыманні чалавекам навакольнага асяроддзя. Дамінуючым элементам жыцця стала рэлігійнасць, якая праявілася ва ўсіх сферах дзейнасці. Катэгорыя «агульнага здаровага сэнсу» саступіла месца эматыўна-вобразнай карціне свету. Замест сукупнасці норм і правіл, якія рэгулявалі жыццё чалавека ў Антычнасці, на першы план выходзіць рэлігійны вопыт і рэлігійная афарбоўка жыцця, насычанага духоўным зместам, дзякую-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чы чаму адбываецца зліццё духоўнага і пачуццёвага. Жыццё правакуе чалавека на здзяйсненне грахоўных учынкаў, даючы яму разнастайныя спакусы, але ж яно і дае магчымасць загладзіць свае грахі маральнымі дзеяннямі [11]. Чалавечы свет не быў адзінай магчымай рэальнасцю, а цалкам залежаў ад свету іншага, мог змяняцца па жаданні Бога – гэта адзін з галоўных пастулатаў светаўспрымання людзей Сярэдневякоўя.

У разуменні сутнасці паўсядзённага жыцця важнай крыніцай выступае трактат А. Аўгусціна «Аб градзе Божым», у пятнаццатай кнізе якога даецца характарыстыка граду зямному і граду нябеснаму, што яскрава адлюстроўвае ўсеагульную карціну свету людзей Сярэдневякоўя [1].

Град зямны створаны любоўю да сябе і пагардай да Бога, град нябесны – любоўю да Бога, якая грунтуецца на пагардзе да сябе. Сэнс жыцця чалавека ў такім рэчышчы зводзіцца да далучэння да Бога і пераходу да вечнага жыцця ў градзе нябесным, а паўсядзённае жыццё – да сукупнасці дзеянняў, якія спрыяюць гэтаму.

Адной з асноўных характарыстык светаўспрымання чалавека Сярэдневякоўя з'яўляецца супрацьпастаўленне: «свой-чужы» ў дачыненні да грамады; «свет-цемра» ў мастацтве і архітэктуры; «калі не А, дык Б» як формула, якая паказвае сітуацыю выбару, з якой сутыкаўся чалавек у выніку сваёй няўпэўненасці ў гэтую эпоху. Само паўсядзённае жыццё было супрацьпастаўленнем побытавай паўсядзённасці (якую Ё. Хёйзінга ў «Восені Сярэдневякоўя» назваў бессэнсоўным і аморфным вываратам жыцця [31]) і святочных праяў (мастацтва, веры, рытуалаў і свят). Акрамя ўсяго іншага, у дадзеную эпоху адбываецца першая спроба асэнсавання канцэпту «прыватнае жыццё». У сярэдневяковых грамадствах назіраецца адсутнасць адчувальнай мяжы паміж публічным і прыватным жыццём. Элементы сацыяльных практык (багацце і беднасць, міжчалавечыя стасункі і г. д.) дэманстратыўна выстаўляліся напаказ, назіралася поўная адсутнасць асабістай прасторы чалавека [27].

Паўсядзённасць у Сярэдневякоўі – гэта само жыццё, у якім пастаянна змяняліся праца і адпачынак, забавы і руціна. Калі для Антычнасці характэрным быў разгляд пэўных аспектаў паўсядзённага жыцця філосафамі, то ў Сярэдневякоўі такую ролю пераняла бытапісальная літаратура, асабліва жыццяпісы (напр. «Жыццяпіс трубадураў») і ліставанні (напр. «Лісты» Кацярыны Сіенскай) [8; 26].

Бінарнасць сярэдневяковага свету праяўлялася ў існаванні надзвычайнай рэлігійнасці побач з карнавальнай (смехавой) культурай, карані якой зыходзяць з народнай творчасці. У аснове любога карнавалу – свята, а ў аснове любога свята – канцэпцыя перакуленага свету: тое, што з'яўляецца добрым для рэлігійнасці, становіцца дрэнным для карнавальнасці, і наадварот. Такі перакулены свет даваў магчымасць чалавеку на пэўны час пазбавіцца догмаў паўсядзённага жыцця і адчуць сваю чалавечую сутнасць.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

Ідэалы Антычнасці вярнуліся на гістарычную сцэну ў эпоху Адраджэння. Пазбавіўшыся сярэдневяковай аскезы, людзі Адраджэння рэабілітуюць культурныя парадыгмы Старажытных Грэцыі і Рыма, цэнтрам увагі становіцца этыка асалоды і прыгажосці. Уяўленні аб прызначэнні чалавека, аб яго ладзе жыцця перажываюць істотныя змены – яго разглядаюць як сутворцу Бога, здольнага змяніць сябе і сваё жыццё, творчую асобу, якая ў меншай ступені залежыць ад знешніх абставін, а значна больш – ад уласнага патэнцыялу. Асноўны сацыяльны канцэпт эпохі – «жаданне цудоўнага жыцця», ён ператварае будні ў свята, жыццё чалавека афарбоўваецца ў яскравыя колеры. Паўсядзённае жыццё прадстае ў штучнай, стылізаванай форме. Шанаванне Антычнасці стварала ілюзію аднаўлення жыццёвага ладу мінулага. Разам з яскравасцю, радасцю жыцця адбылося фарміраванне трагічнага гуманізму, які ўспрымаўся як расчараванне ва ўвасабленні ідэалу. Ідэал, нарэшце, бачыцца ўтопіяй, але не пазбаўляе чалавека прагі да яго спасціжэння.

Па меры секулярызацыі культуры, функцыя структуравання паўсядзённасці пераходзіць да мастацтва і навукі. Жыццё чалавека атрымлівае новае ўвасабленне, яно перастае разглядацца як сукупнасць рытуалаў, але становіцца асэнсаваным і магчымым да разгляду ў гуманітарным дыскурсе.

У якасці грамадскай ідэі аднаўляюцца пастулаты аб неабходнасці супрацоўніцтва дзеля агульнага дабра. Чалавек Адраджэння не імкнецца да выканання выключна сваіх патрэб, але і дбае аб грамадскіх справах. Грамадская еднасць разглядаецца як шлях да вырашэння сацыяльных праблем эпохі, а ўвага да грамадскіх патрэб становіцца падмуркам для вяртання катэгорыі «агульнага здаровага сэнсу». Здаровы сэнс разумеецца як рацыянальнасць, гэта значыць максімізацыя выгады і мінімізацыя страт [12].

Мысліцелі эпохі Адраджэння Мікалай Кузанскі (1401–1464) і Эразм Ратэрдамскі (1466–1536) у поглядах на «агульны здаровы сэнс» адстойвалі ідэі ўнікальнасці і велічнасці чалавека. Гуманістычная канцэпцыя М. Кузанскага аб яднанні супрацьлегласцей у Адзінстве ўвасобілася ў пастулаце «Бог ёсць Адзінства». Падмуркам усяго існага ён называе пантэістычны безасабісты пачатак – Бога, і сцвярджае, што ўсе падзеі, з'явы ў сусвеце з'яўляюцца тоеснымі, бо яны ёсць праявай Бога. Такія ўяўленні сталі своеасаблівым мастом паміж пастулатамі сярэдневяковай схаластыкі і рэнесанснымі ідэямі аб унікальнасці і велічнасці чалавека. З гэтага пункту гледжання можна вывесці і разуменне сутнасці «агульнага здаровага сэнсу» ў спадчыне М. Кузанскага. Для яго здаровы сэнс – сродак, які закліканы карэкціраваць крайнасці, выступаць у якасці супрацьдзеяння залішняй заблытанасці і ўскладненню [16].

Э. Ратэрдамскі разглядаў здаровы сэнс як падмурак існавання чалавека. У трактаце «Пахвала дурасці» вучоны супрацьпаставіў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

здаровы сэнс надзвычайным разважанням (практычная дакладнасць таксама супрацьпастаўляецца тэарэтычнай абстрактнасці). Філасофія, на яго думку, павінна дапамагаць людзям вырашаць шматлікія праблемы ў рэальным жыцці, а не прапаноўваць «невуцкаму натоўпу» сілагізмы, канклюзіі, каралярыі, супазіцыі, а таксама такое мноства напрамкаў філасофіі, «што лягчэй выбрацца з лабірынта, чым з сетак рэалістаў, наміналістаў, тамістаў, альбертыстаў, акамістаў, скатыстаў і іншых» [25].

Паўсядзённасць у эпоху Адраджэння – гэта адзін са спосабаў чалавечага быцця, які робіць жыццё людзей больш простым, дакладным і змястоўным, дапамагае асобе, пазбаўленай жорсткіх рэлігійных абмежаванняў, поўнасцю раскрыцца. Рэферэнтнай групай у такіх умовах выступаюць прадстаўнікі вышэйшых саслоўяў – яны аб'ядноўваюць у сваіх дзеяннях і прагу да задавальнення сваіх асабістых патрэб, і дзеянні ў інтарэсах грамадства і дзяржавы, развіваючы і пашыраючы культурныя і эканамічныя веды.

У той жа час куртуазная сістэма сацыяльных стасункаў, якая сфарміравалася ў Сярэднія вякі, пазбаўляецца рамантызму і ператвараецца ў своеасаблівы кодэкс гонару. У межах куртуазнасці выпрацоўваюцца правілы добрага тону, ветлівасці і паслужлівасці, што ў далейшым стварае значна больш вытанчаны этыкет, а сярод арыстакратыі папулярнымі становяцца свецкія забавы. Дадзенаму перыяду было характэрна супрацьстаянне аскетызму Сярэдневякоўя і геданізму Адраджэння. На хвалі апошняга чалавек спрабуе пераасэнсаваць сваю ролю, да яго прыходзіць усведамленне таго, што ён з'яўляецца ўнікальнай асобай са сваімі жаданнямі, патрэбамі і ідэаламі. У далейшым такія змены ў самаідэнтыфікацыі спрыялі вылучэнню катэгорый «прыватнае жыццё» і «прыватная прастора».

Да канца XVII ст. чалавек разглядаўся як частка пэўнай сацыяльнай або сацыяпрафесійнай групы, але не як асоба. Узнікненне сферы прыватнага (існавала як форма праяўлення асабістых сацыяльных кантактаў і эмацыянальных аспектаў) звязана з мадэрнізацыяй сярэдневяковага грамадства і вызваленнем асабістай свядомасці ў другой палавіне XVII ст. Асноўныя кірункі трансфармацыі назіраліся ў наступным: дзяржава атрымала дастатковую моц, каб уплываць на развіццё грамадства; сярод членаў грамады пашырылася дасведчанасць, што стала вынікам развіцця друкарскай справы; з'явіліся новыя формы праяўлення рэлігійнасці (напрыклад мысленная малітва, або хрысціянская медытацыя). Гэтыя кірункі прывялі да паступовай прыватызацыі многіх сацыяльных практык і рытуалаў і вылучэння прыватнага жыцця ў асобную сацыяльную катэгорыю.

У эпоху ранняга Новага часу ў прыярытэце было публічнае жыццё над прыватным. У разуменні заходнееўрапейскай арыстакратыі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

публічнае жыццё існавала толькі там, дзе чалавек набліжаны да двара і караля, выконваючы асноўную функцыю – абарону інтарэсаў манархіі і дзяржавы. Прыватнае жыццё (напрыклад сямейныя стасункі) у гэтым кантэксце з'яўлялася толькі фонам, на якім адбываліся асноўныя падзеі. Дадзеная ідэя знайшла сваё ўвасабленне ў творчасці Ф. дэ Ларашфуко [14].

Для культуры XVII ст. характэрнай стала бытапісальная літаратура. Аўтары пераважна ў мастацкай форме адлюстроўвалі рэальнае жыццё, дэталёва апісвалі падзеі, сацыяльныя асаблівасці свайго часу. Варта зазначыць, такі рэалізм адрозніваўся ад рэнесанснага, які імкнуўся да пошуку гармоніі і прапагандаваў культ прыгажосці.

Так, апісальна-маралістычны твор Ж. дэ Лабруера «Характары…» быў накіраваны на праўдзівае адлюстраванне жыцця французскага грамадства і яго заган. У афарыстычнай форме аўтар падкрэслівае праблемы грамадства – адсутнасць абгрунтаваных думак, залежнасць ад меркавання іншых: «Людзі часта кіруюцца не столькі густам, колькі прыхільнасцю; інакш кажучы, на свеце мала людзей, надзеленых не толькі розумам, але, звыш таго, яшчэ правільным густам і здольнасцю да справядлівых меркаванняў» [13, с. 348].

Даследаванне з'явы паўсядзённасці некаторымі прадстаўнікамі філасофіі здаровага сэнсу ў XVIII ст. зводзілася пераважна да крытэрыю «практычнай карысці», што нагадвала пастулаты навукоўцаў эпохі Адраджэння пра агульны здаровы сэнс. У кантэксце разгляду сюжэтаў паўсядзённасці філасофія здаровага сэнсу надала з'яве статус прызнанай рэальнасці [21]. Здаровы сэнс XVIII ст. праявіўся ў творчасці англійскага філосафа Б. дэ Мандэвіля, у прыватнасці, у творы «Вулей, які наракае, або Ашуканцы, якія сталі сумленнымі» [20].

У другой палавіне XVIII ст. увага філосафаў была скіравана на ўнутраны свет чалавека. Галоўнымі аб'яўляліся пачуцці і сутнасць чалавека, а не дзяржаўнае ці публічнае. Такія змены прывялі да з'яўлення сентыментальнага напрамку ў еўрапейскай культурнай спадчыне. Чалавек у сентыменталізме цікавы перш за ўсё сваімі пачуццямі і жыццём. Яго сацыяльныя практыкі, дзеянні, стасункі ў якасці паўсядзённага становяцца аб'ектам інтарэсу аўтараў-сентыменталістаў – Ж.-Ж. Русо ў Францыі, Л. Стэрна ў Англіі, М. Карамзіна ў Расіі.

Усведамленне глыбіні пачуццяў чалавека прывяло да зараджэння ў канцы XX ст. рамантызму. Заснуоўваючыся на ідэі дуалізму, накшталт «існуе свет, у якім чалавек жадае жыць, і свет, у якім ён жыве», аўтары-рамантыкі супрацьпастаўлялі «вульгарную» паўсядзённасць (якую яны адмаўлялі) эматыўнай прыродзе асобы. Рэчаіснасць у рамантыкаў – перш за ўсё Дж. Байрана, В. Гюго, паэтаў «Азёрнай школы», Ж. Санд утрымлівае невырашальныя супярэчнасці і таму падвяргаецца жорсткай крытыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прадстаўнікі рамантычнага напрамку ў творчасці засяродзілі ўвагу на народным побыце, сацыяльных практыках, творчым развіцці асобы з мэтай раскрыцця характару паўсядзённага жыцця.

Як адлюстравана культура паўсядзённасці ў айчыннай гісторыка-культурнай спадчыне?

У помніку сярэдневяковай беларускай літаратуры «Аповесці жыцця і смерці Еўфрасінні Полацкай» [28, с. 73–87] гучыць ідэя адмаўлення ад зямнога на карысць служэнню Богу. Падзеі, апісаныя ў «Аповесці…», паўтараюць канцэпт еўрапейскага тэацэнтрызму («Чалавечы свет мог змяняцца па жаданні Бога»). Княгіня Еўфрасіння ў бачанне зямнога жыцця чалавека ўкладае асабістыя сэнсы. У апошнія дні жыцця яна спазнала не адчай ці страх, а радасць ад хуткага пераходу ў Царства Нябеснае.

Вытокі рэнесанснай карціны свету назіраюцца ў спадчыне Ф. Скарыны. У традыцыях еўрапейскага Адраджэння ён надаваў асноўную ролю ўнутранаму свету і розуму чалавека. Найвышэйшая мэта жыцця, адлюстраваная ў «Прадмове да кнігі Іоў» – навучанне («…людзям паспалітым да навучання», «найвышэйшая мудрасць – … пазнанне самога сябе») [Там жа].

Канцэпцыя «публічнага і прыватнага жыцця» Ф. дэ Ларашфуко прагучала задоўга да выдання «…Мемуараў» у сюжэце беларускай «Навелы пра ажэнства караля Жыгімонта Аўгуста з Барбарай Радзівіл». У творы выразна адлюстраваны сувязі паміж прыватным жыццём арыстакратычных асоб і яго ўплывам на жыццё публічнае («…не чыніў няславы іх дому», «усім людзям <…> тая жаніцьба была нямілай») [Там жа, с. 172–174].

Публіцыстычным зводам ці дзённікам XVII – першай палавіны XVIII ст., якія ўвайшлі ў скарбонку беларускай культуры, – «Дыярыуш Афанасія Філіповіча», «Гістарычныя запіскі» Ф. Еўлашоўскага і «Дыярыюш» князя Міхала Казімера Радзівіла («Рыбанькі») [Там жа, с. 471–502, с. 339–349; 7] – характэрны індывідуалізм у апісанні падзей. Аўтары на сваіх уласных прыкладах імкнуліся да характарыстык людзей, блізкіх па сацыяльным статусе.

У XVIII–XIX стст. на землях Беларусі пашырылася мемуарыстыка, адметнай асаблівасцю якой з'яўляецца нарастанне рэфлексіі. Аўтары ўсё больш разважалі аб уласным досведзе, пачуццях, сэнсе жыцця, што ўказвае на ўласцівы для эпохі Асветы і рамантызму зварот да ўнутранага свету асобы. Ва ўспаміне-рамане «Авантуры майго жыцця» С. Русецкай увага надаецца не толькі апісанням прыгод і вандровак аўтара, але і ўласным перажываням, думкам і намерам [23]. Безумоўна, дадзеная акалічнасць дазваляе ў пэўнай ступені разглядаць «Авантуры…» у межах еўрапейскага сентыменталізму другой палавіны XVIII ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цікавай формай мемуарнай літаратуры былі ўспаміны-генеалогіі (напрыклад «Памятка пра род Літавораў Храптовічаў ад першых звестак да 1795 г.» І. Храптовіча), у якіх дэталёва апісвалася гісторыя роду, а галоўнае – прасочвалася ідэалізацыя мінулага. Увогуле на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай ідэалізацыя мінулага, асабліва таго, якое прыпала на канец існавання дзяржавы, была адной з асноўных тэндэнцый мемуарыстыкі [19, с. 99]. Відавочна, невыпадкова верхняй мяжой «Памяткі…» быў абраны 1795 г.

У канцы XVIII ст. спробы асэнсаваць паўсядзённае жыццё чалавека не выходзілі па-за межы бытапісальніцтва. У лістах, мемуарах, апісаннях вандровак і іншых крыніцах адбывалася назапашванне эмпірычнага матэрыялу аб асаблівасцях нораваў, ладзе жыцця розных сацыяльных груп у пэўных рэгіёнах. Гэтыя крыніцы, нягледзячы на сваю каштоўнасць, не давалі ўяўлення аб сутнасці паўсядзённага жыцця, а займаліся выключна фіксацыяй яго праяў.

Адпаведныя тэндэнцыі працягваліся і ў першай палавіне XIX ст. Так, В. М. Севяргін адлюстраваў уражанні ад наведвання тэрыторыі Беларусі ў «Запісках падарожжа па заходніх правінцыях Расійскай дзяржавы» (1803) і ў «Працягу запісак …» (1804). У 1818 г. З. Даленга-Хадакоўскім была выдадзена праца «Аб славянстве да хрысціянства», у якой дадзены звесткі аб побыце і культуры старажытнаславянскага насельніцтва [6]. Я. Чачот, член таварыства філаматаў, на хвалі зацікаўленасці народнай культурай выдаў 6 зборнікаў вуснай народнай творчасці «Сялянскія песні з-пад Нёмана і Дзвіны» (1837–1846) [32]. Вынікам вандроўкі братоў Тышкевічаў па р. Вілія стала краязнаўчая манаграфія «Вілія і яе берагі» (1856), частка якой распавядае аб народнай культуры жыхароў навакольных мясцін [30]. А. Кіркор выдаў папулярны даведнік «Шпацыр па Вільні і ваколіцах» (1856). Краязнаўчая і бытапісальная дзейнасць у Беларусі звязана таксама з асобамі Т. Нарбута, Я. Баршчэўскага, Р. Падбярэзскага, К. Буйніцкага, Э. Плятэр і інш.

У сярэдзіне XIX ст. мемуарная і бытапісальная літаратура адасобіліся ў асобныя катэгорыі крыніц і пачалося паступовае фарміраванне навуковых падмуркаў для разгляду паўсядзённасці ў якасці асаблівай формы існавання чалавека.

Падсумоўваючы сказанае, трэба адзначыць, што канцэпт паўсядзённасці ў еўрапейскай і беларускай культурах цягам стагоддзяў развіваўся ў межах агульнакультурнага дыскурсу. Парадыгма мыслення людзей кожнай эпохі ўносіла свае карэктывы ў разуменне сутнасці паўсядзённага.

Так, у Антычнасці паўсядзённасць была формай існавання чалавека, пры якой палісная сістэмай забяспечвалася яго ўпэўненасць у быцці, у Сярэдневякоўі – гэта выяўленне прагі чалавека да богаўгодных спраў, але адначасова і прастора для часовага вызвалення ад догмаў. Паўсядзённасць Адраджэння раскрывае асобу чалавека, які пачынае ўсведамляць сябе



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самадастатковай адзінкай і адчувае права на прыватнасць. Гэтыя ідэі перайшлі ў XVIII ст. і ператварыліся ў супрацьпастаўленне жыцця прыватнага і публічнага. Паўсядзённасць у гэты перыяд разглядаецца ў якасці жыцця, якое раскрывае ўнутраны патэнцыял чалавека, яго эматыўную прыроду.

У першай палавіне XIX ст. паўсядзённасць уяўляе сабой набор практык, звычаяў, традыцый, якія вылучаюць групу людзей з шэрага і фарміруюць яе ўнікальнасць.

Увогуле асэнсаванне феномена паўсядзённасці як часткі сацыякультурнай прасторы – працэс незавершаны і патрабуе далейшага вывучэння.

1. *Августин, А.* Творения : в 4 т. / А. Августин. – СПб. : Алетейя, 1998. – Т. 4 : О Граде Божием. Книги XIV–XXII. – 592 с.

2. *Аристотель.* Физика / Аристотель ; пер. В. П. Карпова. – М. : Соцэкгиз, 1937. – 228 с.

3. *Бохан, Ю. М.* Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII стагоддзя / Ю. М. Бохан, А. А. Скеп'ян. – Мінск : Беларусь, 2011. – 271 с.

4. *Гиро, П.* Быт и нравы древних греков : пер. с фр. / Поль Гиро. – Смоленск : Русич, 2002. – 619 с.

5. Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства : матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый», Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г. / рэдкал.: В. Скалабан (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. – 364 с.

6. *Даленга-Хадакоўскі, З. Я.* Выбранае / З. Я. Даленга-Хадакоўскі. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – 444 с.

7. Дыярыюш князя Міхала Казімера Радзівіла [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://pawet.net/library/history/bel_history/_memoirs/005_m/Дыярыюш_князя_Міхала_Казімера_Радзівіла.html/. – Дата доступу: 25.06.2019.

8. Жизнеописания трубадуров / пер. С. В. Петрова [и др.]. – М. : Наука, 1993. – 735 с.

9. *Касаткина, С. С.* Городская повседневность как направление социально-философских исследований / С. С. Касаткина // Вестн. Костром. гос. ун-та им. Н. А. Некрасова : сб. ст. / КГУ им. Н. А. Некрасова ; редкол.: В. В. Груздев (гл. ред.) [и др.]. – Кострома, 2011. – № 3. – С. 89–92.

10. *Кнабе, Г. С.* Древний Рим – история и повседневность : Очерки / Г. С. Кнабе. – М. : Искусство, 1986. – 207 с.

11. *Козьякова, М. И.* История. Культура. Повседневность. Западная Европа: от античности до 20 века / М. И. Козьякова. – М. : Весь Мир, 2002. – 360 с.

12. *Куликов, Д. В.* К вопросу о повседневности как культурной универсалии / Д. В. Куликов // Вестн. Ленингр. гос. ун-та им. А. С. Пушкина : сб. ст. / ЛГУ им. А. С. Пушкина ; редкол.: С. Г. Еремеев (гл. ред.) [и др.]. – СПб., 2010. – № 3. – С. 112–118.

13. *Лабрюйер, Ж. де.* Характеры, или Нравы нынешнего века / Ж. де Лабрюйер. – М. : АСТ : ЛЮКС, 2004. – 461 с.

14. *Ларошфуко, Ф. де.* Максимы и размышления. Мемуары / Ф. де Ларошфуко. – М. : Эксмо, 2007. – 528 с.

15. *Леви-Брюль, Л.* Первобытное мышление / Л. Леви-Брюль ; пер. с фр. Б. И. Шаревской. – М. : КРАСАНД, 2017. – 338 с.

16. *Лелеко, В. Д.* Пространство повседневности в европейской культуре / В. Д. Лелеко. – СПб. : СПбГУКИ, 2002. – 303 с.

17. *Лотман, Ю. М.* Беседы о русской культуре : Быт и традиции русского дворянства (XVIII – начало XIX в.) / Ю. М. Лотман. – СПб. : Искусство-СПб, 1994. – 399 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*18. Людтке, А.* Что такое история повседневности? Ее достижения и перспективы в Германии / А. Людтке // Социальная история. Ежегодник. 1998–1999. – М., 1999. – С. 77–100.

*19. Мальдзіс, А. І.* Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі : эсэ ; Восень пася-род вясны: аповесць, сатканая з гістарычных матэрыялаў і мясцовых паданняў / А. Мальдзіс. – Мінск : Мастац. літ., 2009. – 479 с.

*20. Мандевиль, Б.* Басня о пчелах, или Пороки частных лиц – блага для общества / Б. Мандевиль. – М. : Наука, 2000. – 291 с.

*21. Милютин, Ю. Е.* Философия «здравого смысла» в контексте культуры английского Просвещения : дис. … д-ра филос. наук : 09.00.13 / Ю. Е. Милютин. – СПб., 2002. – 288 с.

*22. Мосс, М.* Социальные функции священного / Марсель Мосс ; пер. с фр. И. В. Утехина. – СПб. : Евразия, 2000. – 446 с.

*23. Пільштынова, С. Р.* Авантуры майго жыцця : раман / С. Р. Пільштынова. – Мінск : Попурри, 2015. – 382 с.

*24.* Платонанет [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://platona.net/board/filosofskij_slovar/zdravyj_smysl/1-1-0-156. – Дата доступа: 22.04.2019.

*25. Роттердамский, Э.* Похвала Глупости / Э. Роттердамский. – Калининград : Янтарный сказ, 1995. – 214 с.

*26. Сиенская, Е.* Письма / Е. Сиенская ; пер. А. В. Топорова. – М. : Ладомир : Наука, 2013. – 519 с. – (Литературные памятники).

*27. Смирнова, Е. Д.* Повседневность Средневековья в современной зарубежной медиевистике / Е. Д. Смирнова // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – Вып. 7. – С. 214–221.

*28.* Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.) / уклад., прадм. і камент. І. Саверчанкі. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – 609 с.

*29. Тейлор, Э. Б.* Первобытная культура : в 2 кн. : пер. с англ. / Э. Б. Тейлор ; под ред. В. К. Никольского. – М. : Терра-Книжный клуб, 2009. – 960 с.

*30. Тышкевіч, К.* Вілія і яе берагі / К. Тышкевіч ; уклад., прадм., пер. пол. тэкстаў У. Васілевіча. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – 636 с.

*31. Хёйзинга, Й.* Осень Средневековья / Й. Хёйзинга. – СПб. : Азбука, 2018. – 719 с.

*32. Чачот, Я.* Выбраныя творы / Я. Чачот. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1996. – 374 с.

*33. Шпилевский, П. М.* Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П. М. Шпилевский. – Минск : Беларусь, 2004. – 251 с.

*34. Шютц, А.* Смысловая структура повседневного мира: очерки по феноменологической социологии / А. Шютц. – М. : Ин-т Фонда «Общественное мнение», 2003. – 336 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*V. Sidarovich*

**Concept of everyday life in European culture (from antiquity to the middle of the XIXth century)**

*The article is devoted to the historical and philosophical review of the ideas on the basis of which the research of the phenomenon of everyday life began from the second half of the XIXth century. The ancient idea of "common sense", and peculiarities of everyday human life through the theocentric prism in the Middle Ages are considered. The influence of social and cultural characteristics of the Renaissance on the formation of ideas about everyday life, the separation of the concept of "private life" in the XVIIth century, the appeal to a man's inner world in the XVIIIth century, and the representation of these processes in the cultural heritage of Belarus are traced. The relevance of the phenomenon of everyday life, which reveals the objective (impact of society) and subjective (individual development of the individual, its interaction with society) essence of human existence, is underlined.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 28.10.2019.